роды, не умеу мысліць абстрактна, спалучаў у сваей дзейнасці матэрыяльную і духоўную сферы, не раздзяляючы іх. І у нас час сінкрэтызм не страціўся у музычным фальклоры, напрыклад, у карагодах, дзе адначасова выступаюць песня, танец, тэатральнае дзеянне.

5. Каб святы не былі падобныя адно на другое, рэжысеру трэба вывучыць мясцовую фальклорную традыцыю. У прынцыпе кожная вёска, раен, рэгіен маюць свае фальклорныя асаблівасці. Яны заключаюцца у тым рэпертуары, які бытуе у данай мясцовасці, манеры спеваў, гукаўтварэнні, дыялектах, абрадах, касцюмах і інш. Рэжысер павінен вывучыць гэтыя асаблівасці у жывым іх бытаванні, знаемячыся з людзьмі, вывучаючы адпаведную літаратуру па фальклору, гісторыі, этнаграфіі, мастацтвазнаўству і інш.

6. На першай ступені вывучэння фальклорнай традыцыі рэжысер выступае у ролі вучня. Іншага шляху у гэтай справе няма.

7. Другая стадыя авалодання рэжысерам мясцовай спецыфікі фальклору заключаецца у тым, што ен становіцца роўным партнерам у творчым працэсе з непасрэднымі носьбітамі традыцыі.

8. Трэцяя ступень у гэтай методыцы завяршаецца, нарэшце тым, што рэжысер становіцца кіраўніком, уласна рэжысерам.

Такім чынам сістэма авалодання рэжысерам мясцовай музычнай спецыфікі фальклору заключаецца у трыядзе: вучань - роўны партнер - кіраўнік (рэжысер).

## БЕЛАРУСКІЯ КІРМАШЫ ХХ СТАГОДДЗЯ

П.А.Гуд

Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі штогадовыя святочныя гандлі на тэрыторыі Беларусі, з прычыны таго, што тэрыторыя рэспублікі была тэатрам ваенных дзей, не ажыццяўляліся. Толькі у гады НЭПа кірмашовы гандаль трохі ажывіўся, але ен быў непрацяглы і у параўнанні з дарэвалюцыйнымі часамі адбываўся у значна меншай колькасці населеных пунктаў.

У 30-я гады масавая калектывізацыя сельскай гаспадаркі, нацыяналізацыя прамысловасці і гандлевых прадпрыемстваў, рост

кааператыўнага гандлю, а таксама інтэнсіўнае развіццё сеткі крамнага гандлю прывялі да знікнення на тэрыторыі БССР кірмашоў як штогодніх святочных гандляў. У Заходняй Беларусі, якая да 1939 г. знаходзілася ў складзе Польшчы, дзе ў эканоміцы панавалі рыначныя адносіны, кірмашы і ярмаркі захаваліся да Вялікай Айчыннай вайны. Разам з тым, развіццю кірмашоў перашкаджалі і тое, што пад уціскам будаўнікоў новага ладу у БССР замест традыцыйных восеньскіх кірмашоў і фэстаў, якія ладзілі на Пакровы на сей Беларусі, у святочны дні беларусаў сталі ўводзіц новае сацыялістычнае свята - свята Ураджая. Гэтае свята, якое будавалі на аснове рытуальна-відовішчных форм, з кожным годам страчвала галоўную вартасць - актыўны ўдзел людзей, змушаючы прысутных быць толькі назіральнікамі, толькі спажыўцамі. Таму святы ўраджаю мелі стандартную, шаблонную форму, яны даволі цяжка прывіваліся на беларускай зямлі, асабліва ў заходніх раёнах, дзе захаваліся традыцыі правядзення кірмашоў.

Першы пасляваенны беларускі кірмаш, адраджэнне якога на народнай аснове з вялікім поспехам адбылося ў Століне (кастрычнік 1981 г.), у другой палавіне 80-х - пачатку 90-х гадоў заваёваў такую папулярнасць, што іх арганізоўвалі ужо не толькі ў гарадах і раённых цэнтрах рэспублікі, але і ў калгасах. Адметнымі фрагментамі гэтых святаў сталі гандаль сельскагаспадарчымі і прамысловымі таварамі, разнастайныя гандлёвыя выстаўкі, латарэі, аукцыены, фестываль фальклорнага мастацтва і спартыўныя спаборніцтва, конкурсы народнай музыкі і выканаўцаў прыпеваў, старажытныя кірмашовыя забавы беларусаў. Кірмашы набылі інтэрнацыянальны характар, асабліва ў прыгранічных раёнах, дзе ў свяце удзельнічалі делегацыі з суседніх рэспублік.

Аналіз развіцця сучасных кірмашоў Беларусі сведчыць, што у іх актыўна удзельнічаюць людзі розных узростаў, нават дзеці, для якіх арганізатары на святочных гульнях будуюць спецыяльныя зоны са спецыфічным комплексам дзіцячых забаў, выстаўкай-продажам дзіцячых вырабаў, конкурсамі юных канструктараў, змаганнямі юных авіа- і судамадэлістаў і т.п.

Разам з тым, кірмаш, як унікальная форма спалучэння гандлю, відовішчаў і забаў, стаў асновай стварэння новай з'явы беларускай духоўнай культуры - свята народных рамёстваў. Стварэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Не гэтага свята стала падзеей у культурным жыцці беларусаў, аказала значную падтрымку развіццю народных промыслаў. Практыка паказала, што святы народных рамесстваў аказаліся настолькі прыцягальнымі, што іх сталі ладзіць па ўсей Беларусі не толькі як самастойныя святы: цяпер яны амаль што ва ўсіх гарадскіх паселішчах сталі адной з абавязковых састаўных частак свята горада.

Поспех і папулярнасць адроджанага кірмаша, а таксама яго ўнікальныя магчымасць адначасова задаволіць многія запатрабаванні чалавека аказаі значны ўплыў на развіцце сучаснай святочнай культуры гарадоў Беларусі, дзе пачынаючы з 90-х гадоў ніводная значная ўрачыстасць не абыходзілася без святочнага гандля з відовішчамі і забавамі. Напрыклад, адметнай асаблівасцю свята г.Мінска з'яўляецца грандыёзны кірмаш, які ўяўляе сабой шэраг спецыялізаваных таргоў са спецыфічнымі комплексамі забаў (ярмарка народных рамесстваў, кветкавы рынак, птушыны базар, ярмаркі бытавых паслуг, прамысловых і сельскагаспадарчых тавараў, выстаўкі-продажы вырабаў мастакоў і канструктараў, вырабаў навучэнцаў ПТВ, дзіцячая ярмарка). Асаблівасцю штогодніх гандляў на свяце г.Гродна стала арганізацыя спецыялізаваных таргоў для розных этнічных груп насельніцтва. Ужо некалькі год тут арганізоўваюць беларускі кірмаш, польскі рынак і літоўскую ярмарку як асобныя гандлёва-гульнёвыя зоны, куды прывозяць тавары з Літвы, Польшчы, Беларусі і выступаюць нацыянальныя творчыя і спартыўныя калектывы.

Такім чынам, новая з'ява беларускай святочнай культуры - кірмаш, адрадзіўшыся ў разнастайных формах творчага ўвасаблення, стаў многафункцыянальным святам, якое дае магчымасць чалавеку рэалізаваць розныя матэрыяльныя і духоўныя запатрабаванні.

## СВЯТА, ЯК САЦЫЯЛЬНАЯ УМОВА ФАРМІРАВАННЯ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ ДЗЯЦЕЙ

І.М.Гаранец (аспірантка)

Традыцыі звязваюць час, без іх жыццё губляе свой сэнс, таму што страчвае паслядоўнасць, пераемнасць. Традыцыі гэта не проста звычаі, яны маюць нарматыўны характар. Традыцыі надаюць